Оказывается, может.

Затоптанный талант = апельсины на асфальте.

**Литература**


1. Андреев, А.Н. Вселенная не место для печали : повести / А.Н. Андреев. – Минск : Маст. літ., 2013. – 366 с.
2. Скоропанова, И.С. Концептуальная парадигма прозы Анатолия Андреева : книга монографических ст. / И.С. Скоропанова ; БГУ, Филологический фак., каф. русской литературы. – Минск: 2015. – 135 с.
3. Таланцева, О. Философия элитаризма в прозе Анатолия Андреева : монография / Ольга Таланцева. – Минск : Изд. центр БГУ, 2012. – 240 с.



**Y.N. Pasiutsina**

Vitebsk State University named after P.M. Masherov

findus00@inbox.ru


**«Unwanted» in the society, or Talent is not for sale (A.N. Andreev «Oranges are on the pavement»)**


*Key words: society, talent, person, unwanted, hero.*



*The main hero Oscar Mikhailovich Malakhov is analysed in the article (A.N. Andreev «Oranges are on the pavement»). The article deals with the typology of heroes. The author tries to investigate the tragedy of the main character, to determine the type of the hero, to give its description.*



**І.В. Саверчанка**

Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы НАН Беларусі

e-mail: ivasav@mail.ru



УДК 811.161.3+821.161.3.09


## ЖАНРАВАЯ ШМАТСТАЙНАСЦЬ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ ПРОЗЫ X–XVIII стст.: ПРАБЛЕМЫ АТРЫБУЦЫІ І КЛАСІФІКАЦЫІ


*Ключавыя словы: даўняя беларуская літаратура, стыль, жанр, атрыбуцыя, класіфікацыя.*



*У артыкуле даследуецца жанравая шматстайнасць старабеларускай прозы X – XVIII стст. з пункту гледжання атрыбуцыі і класіфікацыі.*


На працягу X–XVIII стст. беларускія майстры мастацкага слова стварылі багатую эпічную літаратуру, шматстайную ў жанравым плане і тэматычна надзвычай разгалінаваную.

Выбар пэўнай жанравай формы, тыпу дыскурса – істотны эстэтычны арыенцір, важнае творчае рашэнне пісьменніка, якое наўпрост залежала ад ідэйна-мастацкай стратэгіі майстра слова, а таксама выбару сферы і прадмета літаратурнага асэнсавання.

Менавіта таму вывучэнне творчай стратэгіі і жанравай сістэмы белетрызаваных твораў X–XVIII стст. належаць да ліку базавых літаратуразнаўчых праблем, рашэнне якіх дазваляе глыбей зразумець характар паэтыкі і эстэтыкі старабеларускай літаратуры, паўней асэнсаваць яе культуралагічны і мастацкі феномен.

Адна з галоўных задач, якую ставілі перад сабой майстры слова X – XVIII стст., – паказаць барацьбу князёў і шляхецкіх груповак за найвышэйшую ўладу. Палітычным і вайсковым падзеям прысвечаны шматлікіясказанні, словы, пахвалы, занатоўкі, навелы, мініяцюры, запісы, аповесці, летапісы і хронікі.Да гэтай асноўнай жанравай групы належаць каля трох дзесяткаў яркіх помнікаў нацыянальнага прыгожага пісьменства.

Найбольш старажытнымі свецкімі эпічнымі творамі з’яўляюцца: “Сказанне пра запрашэнне варагаў”, “Занатоўкі пра Рагнеду”, “Мініяцюра пра рэйд Брачыслава на Ноўгарад”, “Слова пра славянскія плямёны, іх звычаі і пісьменства”, “Аповеды пра Усяслава Чарадзея”, “Полацкі летапіс”, “Слова пра князёў”, “Пахвала князю Расціславу Мсціславічу”.

Выключна загадкавы і надзвычай цікавы летапісны твор –*“Сказанне пра запрашэнне варагаў”.* Яго старажытны арыгінал не захаваўся. “Сказанне…” чытаецца паводле Лаўрэнцеўскага і Радзівілаўскага летапісаў. Верагодней за ўсё, яно было напісана ў Полацку ў другой палове X ст. у часы княжання Рагвалода.

У перыяд Вялікага Княства Літоўскага было створана мноства свецкіх эпічных твораў якраз на старабеларускай мове. На жаль, летапісныя творы перыяду ўзнікнення і станаўлення дзяржавы, як напрыклад, “Аповесць пра Міндоўга”, былі ў шэрагу рэдакцый істотна перароблены, а пасутнасці, дэфармаваны, у наступныя стагоддзі, пераважна, ўплывовымі жамойцкімі магнатамі і каталіцкімі біскупамі.

Старажытную першааснову больш-менш захавалі наступныя помнікі з часоў Вялікага Княства Літоўскага: “Аповесць пра Войшалка”, “Аповесць пра Трайдзеня і яго сына Лаўрэнція”, “Запісы пра




Репозиторий ВГУ

княжанне Віценя", "Аповесць пра Гедзіміна", "Запісы пра княжанне Альгерда", "Аповесць пра вялікага князя Альгерда", "Аповесць пра Ягайлу", "Летапіс княжання Вітаўта", "Аповесць пра рыцарскія справы і ўчынкі Вітаўта Вялікага".

Аўтэнтычнымі помнікамі беларускага пісьменства і, таму, найбольш каштоўнымі, варта лічыць: "Сказанне пра Войшалка", "Сказанне пра Даўмонта", "Сказанне пра бітву на Ворсклі", "Летапісец вялікіх князёў літоўскіх", "Пахвалу вялікаму князю Вітаўту", "Аповесць пра Падольскую зямлю", "Хроніку грамадзянскай вайны", "Аповесць пра паўстанне ў Смаленску", "Летапіс княжання Казіміра Ягайлавіча", "Хроніку падзей і здарэнняў за часамі княжання Казіміра Ягайлавіча".

Найбольш значны помнік беларускага пісьменства – *"Летапісец вялікіх князёў літоўскіх"*, створаны каля 1430 года, верагодна, у Смаленску. Аўтар засяроджваецца на падзеях, якія адбываліся ў Вялікім Княстве Літоўскім пераважна ў другой палове XIV ст. Галоўная сюжэтная лінія "Летапісца…" – складаныя, а часам і драматычныя ўзаемаадносін паміж тагачаснымі валадарамі – Вітаўтам і Ягайлам.

Сапраўдным шэдэўрам беларускай літаратуры XV ст. з'яўляецца *"Пахвала вялікаму князю Вітаўту"*, якая дайшла да нашага часу ў дзвюх рэдакцыях шасці летапісных спісаў. Твор быў напісаны прыкладна каля 1430 г. напярэдадні каранацыі Вітаўта. Аўтар адлюстраваў цэнтралізацыйную дактрыну Вітаўта Вялікага, яго палітыку накіраваную на аб'яднанне ўсходнеславянскіх земляў вакол адзінага цэнтра. Пісьменнік пры гэтым ухваляе геапалітычныя планы вялікага князя, вітае далучэнне да ВКЛ новых гарадоў, тэрыторыяў і земляў.

Значным летапісным творам з'яўляецца *"Аповесць пра Падольскую зямлю"*, якая быластворана каля 1436 года. У ёй абгрунтоўваецца гістарычнае права Вялікага Княства Літоўскага на Падольскую зямлю. Летапісец паказвае беспадстаўнасць захопу гэтай тэрыторыі палякамі пасля смерці Вітаўта Вялікага.

Адным з важнейшых гісторыка-літаратурных твораў, прысвечаных унутраным канфліктам у Вялікім Княстве, з'яўляецца *"Хроніка грамадзянскай вайны"*. Твор захаваўся прынамсі ў трох рэдакцыях. "Хроніка…" пісалася падчас вайны або адразу пасля яе. Як вынікае з семантыкі тэкста, яе аўтарам быў непасрэдны ўдзельнік і відавочца тагачасных падзей. Ён выступае як патрыёт Вялікага Княства Літоўскага, рэзка асуджае прэтэнзіі палякаў на Падольскую зямлю.

Выдатны помнік прыгожага пісьменства Беларусі першай паловы XV ст. – летапісная *"Аповесць пра паўстанне ў Смаленску".* Твор напісаны цудоўнай старабеларускай мовай, на высокім мастацкім ўзроўні і ў рэчышчы нацыянальных эстэтычных традыцый. "Аповесць…", верагодней за ўсё, была створана ў Смаленску, які на той час уваходзіў у склад Вялікага Княства Літоўскага. Яна захавалася ў складзе Супрасльскага, Слуцкага і іншых беларускіх летапісаў. Імя аўтара літаратурнага шэдэўра, на жаль, не захавалася. Шматлікія дэталі "Аповесці…" сведчаць аб тым, што яе стваральнік выдатна арыентаваўся ў гарадскім жыцці і ў палітычных рэаліях таго часу. Унікальнае ідэйна-эстэтычнае значэнне "Аповесці пра паўстанне ў Смаленску" палягае на тым, што ў ёй упершыню ў нацыянальнай мастацкай прозе паказана грамадзянскае непадпарадкаванне і маштабнае ўзброенае паўстанне. Аўтар "Аповесці…" выступіў як пісьменнік-наватар. Ён аб'ектыўна, усебакова і праўдзіва раскрывае логіку гістарычных падзей, асвятляе палітычныя перадумовы, канкрэтныя прычына і абставіны, што прывялі да ўзброенага паўстання ў Смаленску.

Выдатныя ў мастацкіх адносінах белетрызаваныя эпічныя творы, аснову якіх утваралі важныя палітычныя і грамадскія падзеі, ствараліся ў эпоху *Рэнесансу*. Да іх ліку належаць: "Слуцкая хроніка", "Аповесць пра часы князя Аляксандра Казіміравіча", "Хроніка дзяржаўных і вайсковых спраў Аляксандра Казіміравіча", "Пахвала князю Канстанціну Астрожскаму", "Хроніка княжання Жыгімонта І Старога". На старонках свецкіх эпічных твораў майстры слова XVI ст. акцэнтавалі ўвагу на буйных грамадска-палітычных падзеях, пісалі ў першую чаргу пра ўчынкі знакамітых асоб.

Летапісная *"Пахвала гетману Канстанціну Астрожскаму"*, напісаная ў панегірычнай манеры, прысвечана славутай перамозе харугваў гетмана Канстанціна Астрожскага над маскоўскімі войскамі ў 1514 г. пад Оршаю. "Пахвала князю Канстанціну Астрожскаму" чытаецца паводле Валынскага кароткага летапісу. Аўтарам "Пахвалы князю Канстанціну Астрожскаму", магчыма, быў адзін з тагачасных пісараў дзяржаўнай канцылярыіі Вялікага Княства Літоўскага – *Фёдар Святоша*, які шматкроць згадваецца ў восьмай кнізе запісаў Літоўскай Метрыкі. Ён, мяркуючы паводле крыніц, быў вельмі абазнаным чалавекам у тагасным палітычным жыцці.

Адметная рыса мастацкага стылю "Пахвалы князю Канстанціну Астрожскаму" – высокая ступень рытмізаванасці тэксту. На сінтаксічным і лексічным узроўнях аўтар арыентуецца на паэтыку ўзнёсла-гераічнага, былiннага эпасу, што істотна дапамагала яму ствараць каларытны вобраз князя Астрожскага – гераічнага абаронцы народа і краіны.

Асабліва месца ў гісторыі беларускай літаратуры займае летапісная *"Навела пра ажэнства караля Жыгімонта II Аўгуста з Барбарай Радзівіл".* Твор чытаецца паводле Летапісу Рачынскага, які



Рэпазіторый ВДУ

збярогся ў складзе рукапіснага зборніка (Аддзел рукапісаў б-кі Рачынскага ў Познані. № 94. Арк. 235 – 291. "Навела..." змешчана на арк. 289 адв. – 291). У "Навеле..." гаворка, галоўным чынам, ідзе пра асабістыя ўзаемаадносіны Жыгімонта II Аўгуста і Барбары Радзівіл. Гэта, бадай, першы ў беларускай літаратуры твор, у якім на першым месцы знаходзяцца не дзяржаўныя справы, а асвятляецца пераважна інтымнае жыццё вышэйшых дзяржаўных асоб і паказваюцца норавы пры тагачасным двары караля і вялікага князя.

Побач з агульнадзяржаўніцкімі тэмамі і ідэямі ў беларускай эпічнай літаратуры знайшлі адлюстраванне і праявы мясцовага патрыятызму, прыкладам чаго з'яўляецца *"Баркулабаўская хроніка"*, што ўзнікла ў першай палове XVII ст.

Каштоўны летапісны помнік пісьменства эпохі Асветніцтва – рэгіянальная *"Магілёўская хроніка".* Аўтарамі "Магілёўскай хронікі" з'яўляюцца Трафім Сурта – гарадскі лаўнік і Юрый Трубніцкі – рэгент магілёўскай гарадской канцылярыі. У творы надзвычай аб'ёмна і рэалістычна адлюстраваны трагічныя грамадскія падзеі другой паловы XVII – XVIII стст., якія адбываліся ва ўсходняй частцы Беларусі. Гістарычная і літаратурная вартасць "Магілёўскай хронікі" ў тым, што на яе старонках падаюцца тысячы фактаў, мноства займальных сюжэтаў, яркіх замалёвак і цікавых паведамленняў. Асаблівую значнасць маюць цалкам арыгінальныя аповеды і эксклюзіўныя звесткі пра падзеі першай паловы XVIII ст.

Такім чынам, летапісныя аповесці і хронікі, напісаныя на падставе уласных назіранняў летапісцаў, папярэдніх пісьмовых звестак і вусных паданняў з'яўляюцца надзвычай каштоўнымі помнікамі прыгожага пісьменства і гістарыяграфіі. Яны панарамна адлюстроўвалі вайсковыя кампаніі, каранацыі, дынастычныя шлюбы, міжнародныя адносіны, соймы і паўстанні.

У старабеларускай літаратуры ўзніклі творы, у якіх распрацоўваліся *містычныя і легендарныя* сюжэты. Іх з'яўленне абумоўлена спецыфічным светаўспрыманнем тагачаснага чалавека, страхам перад невядомым і схільнасцю да фантастычнага вытлумачэння загадкавых з'яў прыроды,

Найбольш ранняя з містэрый – *"Навела пра паморак у Полацкай зямлі".* Рарытэтны твор быў напісаны ў Полацку ў XI ст. невядомым аўтарам, які, верагодна, перажыў трагедыю горада, на ўласныя вочы бачыў усе жахлівыя наступствы бедства. Першакрыніца "Навелы пра паморак у Полацкай зямлі" не захавалася. Яна чытаецца паводле "Аповесці мінулых гадоў" – найбольш старажытнага ўсходнеславянскага летапіснага зводу XII ст., што ўвайшоў у склад шэрагу летапісаў XIV – XV стст., у прыватнасці, у Радзівілаўскі і Лаўрэнцеўскі. Аўтар асвятляе падзеі ў містычным ключы. Бедства, якое спасцігла Полацкае княстве ў 1092 г. і ў выніку якога памерла мноства людзей, ён лічыць выключна праявай дзейнасці д'яблаў.

Старажытны помнік беларускай літаратуры XII ст. з элементамі містыкі і легендарнасці – *"Слова пра манаха Мартына".* У аснове твора – сюжэт пра цудадзейнае выздараўленне манаха Мартына пры дапамозе святых пакутнікаў Барыса і Глеба.

Асаблівае шанаванне ў Беларусі Божай Маці, вера ў выратавальную моц яе абразоў, паслужыла падмуркам узнікнення цыкла легендарных аповесцяў, у якіх апавядалася пра містычныя праявы, шматлікія цуды. Найбольш старажытны твор – *"Цуды святога Міколы ў Лукомлі".* Помнік створаны ў пачатку XV ст. Дзве сціслыя навелы твора захаваліся ў складзе зборніка "Жыццяў святых", што зберагаецца ў зборы М.М. Ціхамірава (№ 309. Арк.171 адв. – 172 адв.), які ў 1960-х гадах быў перададзены Сібірскаму аддзяленню Расійскай акадэміі навук. Зборнік перапісаны ў першай палове XVI ст. Паводле зместу "Цуды Святога Міколы ў Лукомлі" якраз належаць да містычнай літаратуры, бо ў іх распавядаецца пра з'яўленне каля 1408 г. цудатворцы Міколы да жыхара Лукомля Парфена.

Твор Фёдара Баравіка *"Гісторыя пра Жыровіцкі абраз Божай Маці"* з'яўляецца арыгінальнай аповесцю, у аснове якой ляжаць містычныя падзеі, звязаныя з цудадзейным абразом Маці Божай Жыровіцкай.

Да містычнай літаратуры належаць творы Іаникія Галятоўскага "Аповесць пра Купяціцкі абраз Божай Маці" і "Аповесць пра Жыровіцкі абраз Божай Маці".

У беларускай літаратуры ў старажытны час ўзнікла і актыўна развівалася *духоўная проза.* Пачынальнікам беларускай духоўнай прозы з'яўляецца Кірыла Тураўскі – геніяльны пісьменнік старажытнай Беларусі. Яго пяру належыць шэраг выдатных празаічных твораў на царкоўна-рэлігійныя тэмы, сярод якіх асабліва вылучаюцца тры белетрызаваныя, эпічныя тэксты: "Слова на сабор 318 святых айцоў" і "Слова ў памяць усіх святых".

Падзвіжніцкая, ахвярная дзейнасць і справы выбітных асобаў на ніве асветы, абароны Айчыны, Царквы або Касцёла служыла штуршком (а затым станавілася галоўным аб'ектам мастацкага адлюстравання) гэтак званых *біясаў, або мартырыяў* – жанра, які ўзнік у візантыйскай хрысціянскай літаратуры. Сярод найбольш значных помнікаў старабеларускай жыційнай літаратуры: "Аповесць жыцця і смерці святой, дабраслаўнай і найаздобнейшай Еўфрасінні Полацкай", "Слова пра манаха Марціна", "Памяць святога нашага бацькі Кірылы, епіскапа Тураўскага", "Жыццё і цярпенне

Аўрамія Смаленскага" (каля 30-х XIII ст.) Яфрэма-манаха. Да жыційнай літаратуры прымыкае "Пахвала князю Расціславу Мсціслававічу" (XII ст.).

У эпоху Рэнесанса жыційная літаратура ўзнялася на якасна новы ўзровень, аб чым выразна сведчаць: "Жыццё князя Міхаіла Глінскага, маршалка літоўскага" (Любча, 1560), корпус біясаў, прысвечаных асобе пакутніка Язафата Кунцэвіча (С.Касінскі "Жыццё і пакуты дабраславеннага Язафата". Вільня, 1665; А.Суша "Жыццё і барацьба пакутніка Язафата Кунцэвіча". Рым, 1665; Я.Маліноўскі "Залатая карона над параненай галавой Я.Кунцэвіча, архіепіскапа полацкага". Вільня, 1673).

Вельмі значны помнік літаратуры эпохі Барока – "Аповесць пра пакуты і смерць айца Афанасія Філіповіча", напісаная паводле ўзораў жыційнай літаратуры невядомым берасцейскім манахам.

Падарожжы ў Царград і Іерусалім, з мэтай пакланення святым месцам, а таксама вандроўкі па краінах Еўропы і Афрыкі, спарадзілі ў старажытнай беларускай літаратуры *жанр хаджэнняў, або перэгрынацыяў*. Найбольшую папулярнасць сярод помнікаў пісменства гэтага жанру здабылі творы: ігумена Даніїла "Хаджэнне" (XII ст.), Ігната Смаляніна "Хаджэнне ў Царград і Іерусалім" (кан. XIV ст.), Мікалая Крыштофа Радзівіла "Перэгрынацыя, або Паломніцтва ў Святую Зямлю" (1601) і Тэадора Бялевіча "Дзённік, пісаны ў Англіі пра тое, як там вандравалася і жылося", а таксама два хаджэнні невядомых уніяцкіх пісьменнікаў – "Перэгрынацыя, або Праўдзівае апісанне Зямлі Святой" (Супрасль, 1722) і "Падарожжа да выспы" (Супрасль, 1782).

Старажытныя беларускія гарады-княствы, а затым Вялікае Княства Літоўскае падтрымлівалі шчыльныя *дыпламатычныя сувязі* з іншымі народамі і краінамі, праводзячы актыўную вонкавую палітыку. Дзейнасць дыпламатычных місіяў і вялікіх пасольстваў спачатку фіксавалася ў выглядзе пратакольных запісаў або справаздачаў перад манархам і Соймам, а ў сярэдзіне XVI ст. нарэшце з'явіліся першыя літаратурныя *"пасольскія дзённікі"*. Іх мэта палягала ў тым, каб асвятліць міжнародныя адносіны, і дыпламатычныя перагаворы.

Аўтарства аднаго з іх належыць кіраўніку пасольскай місіі ў Маскву, князю Стафану Збаражскаму. Яго твор мае назву: "Дзённік літоўскіх паслоў" (каля 1556). Да ліку "пасольскіх дзённікаў" варта адносіць "Рэляцыю пасольства ў Маскву ў 1573 г." М.Гарабурды.

Значны эпічны твор на дыпламатычную тэматыку, прычым у двух варыянтах – празаічным і вершаваным, напісаны сакратаром пасольства Гальяшам Пельгрымоўскім. Гэты твор вядомы ў медыявістыцы пад назвай: "Пасольства да вялікага князя маскоўскага" (1601).

У беларускай літаратуры шмат твораў, у якіх падаюцца *падзеі царкоўных сабораў і сінодаў*, іх падрыхтоўка, правядзенне і вынікі. Найбольш значныя сярод літаратурных помнікаў гэтага віда наступныя творы: І.Солтана "Сабор у багавыратавальным горадзе Вільні"; С.Буднага "Апісанне сабору ў Іўі 1568 г."; М.Сміглецкага "Апісанне наваградскага дыспута"; І.Пацея "Справядлівае апісанне ўчынку і справы сынодавай і Абарона здзейсненых згоды і лучнасці, якія сталіся на сынодзе Берасцейскім у 1596 годзе" (Вільня, 1597) і "Рэляцыя" (Вільня, 1609); П.Скаргі "Апісанне і абарона сабора рускага Берасцейскага" (Вільня, 1597); К.Саковіча "Кіеўскі сабор 1640 года" (1642)

Асобную групу белетрызаваных твораў складаюць: "Патэрыкон" С.Косава, "Апалогія перэгрынацыі да ўсходніх краёў" (1628) М. Сматрыцкага, а таксама ананімныя помнікі – "Эктэзіс" (1597), "Апалея Апалогіі" (1628), "Сінопсіс" (Вільня, 1632), "Суплементум Сінопсіс" (Вільня, 1632).

Да ліку эпічных літаратурных форм належыць аднесці адмысловы жанр *"казаняў на смерць"*. У іх дамінавалі белетрызаваныя аповеды, якія, аднак, арганічна спалучаліся з панегірычнымі элементы і публіцыстычнымі ўстаўкамі. Усяго да нашага часу дайшло звыш 90 "казанняў на смерць".

Першы ўзор гэтага жанру у беларускай літаратуры – "Пахвальнае слова мітрапаліту Кіпрыяну" Р.Цамблака. Грамадскую вдомасць атрымалі наступныя казанні: А.Воляна "Надмагільнае слова пра К.Радзівіла" (Вільня, 1604), Я.Зыгровіуша "Казанне на пахаванне М.Дарагастайскага" (Любча, 1616) і "Хрысціянская смерць Еўлашоўскага" (Любча, 1619), Л.Зізанія "Павучанне пры пахаванні Зоф'і Чартарыйскай" (1618), Л.Карповіча "Казанне на смерць Васіля Галіцына" (1619), М.Сматрыцкага "Казанне на смерць Лявона Карповіча" (Вільня, 1620), С.Раговіча "Казанне на ўгодкі яснавяльможнага пана Яна Караля Хадкевіча, ваяводы віленскага" (Вільня, 1622), І.Бабрыковіча "Прамова ў час пахавання Б.Агінскага" (1625), П.Дамжыў-Лютковіча Целіцы "Казанне на смерць А.Шэптыцкага" (1632), С.Косава "Херувім. Пры акце пахавальным айца Іосіфа Бабрыковіча" (Вільня, 1635), М.-С.Савіцкага "Жалобныя цені пасля ясных праменяў пры пахавальным акце Януша Кішкі, ваяводы полацкага" (Вільня, 1640), М.Лаўрыновіча "Дом мудрасці. На пахаванні яснавяльможнага пана Тамаша Сапегі, ваяводы навагрудскага" (Вільня, 1646).

Рукапісны зборнік Самуэля Даніловіча, што захоўваецца ў Цэнтральным гістарычным архіве Літвы, уключае некалькі рэдкіх помнікаў гэтага жанру.

"Казанні на смерць" звычайна мелі трохступенную структуру: аналітычнае разважанне на агульнарэлігійную тэму; эпічны аповяд пра заслугі памерлага, яговыя справы і ўчынкі; нарэшце, публіцыстычны зварот да слухачоў і чытачоў з павучаннем, парадамі і рэкамендацыямі. Некато-

Репозиторий ВГУ

рыя з апублікаваных казанняў уключалі прысвячэнні родзічам памерлага. Так, ў творы Я.Куровіча “Тры дамы вечнасці” (Вільня, 1650), змешчанае прысвячэнне Юрыю і Самуэлю Шверынам, братам памерлага Шчаснага Шверына, у якім у панегірычным стылі ўхваляліся заслугі шляхецкага роду. Менавіта на ўзроўні структурнай будовы ў “казаннях на смерць” закладваўся эпічны пачатак.

Да белетрызаванай літаратуры належыць багатая *эпісталярная* паводле формы пісьмовая спадчына Ф.Кміты-Чарнобыльскага, а таксама лісты і допісы Л.Сапегі.

Пашырэнне асветніцкіх ідэй, культ мастацкага слова, рэнесансавае адкрыццё чалавека спрычыніліся да ўзнікнення ў беларускай літаратуры *аўтабіяграфічных* дыярыюшаў, мемуараў і ўспамінаў. Гэтую плынь нацыянальнай эпічнай літаратуры прадстаўляюць: “Гістарычныя запіскі” Ф.Еўлашоўскага, першая частка “Дыярыуша” А.Філіповіча, “Дыярыуш” П.-К.Абуховіча, “Дыярыуш” С.Маскевіча, “Дыярыуш” Б.-К.Маскевіча, “Успаміны” Я.Цадроўскага, “Дзённік падзей Тлумнага часу” І.Будзілы, “Дыярыуш” А.Каменскага-Длужыка, “Дыярыуш” М.-К.Радзівіла Рыбанькі, “Дыярыуш” М.Матушэвіча, “Мемуары” А.-С.Радзівіла ды інш.

Асобную плынь беларускай белетрыстыкі ўтваралі помнікі *гумарыстычнай і сатырычнай* літаратуры Беларусі. Яна прадстаўлена выдатнымі ў мастацкім плане творамі: “Прамовай Мялешкі”, “Лістом да Абуховіча”, “Казаннем рускім”, “Граматай, напісанай да святога Пятра”, “Прамовай Русіна”. Гумарыстычныя і сатырычныя творы ўзніклі ў перыяд грамадскага крызісу другой паловы XVII – XVIII стст. натуральна ўтрымлівалі эпічныя элементы. Для іх характэрны патрыятычны пафас і выразны дэмакратызм мыслення.

Такім чынам, старабеларуская белетрызаваная літаратура паводле жанрава-тэматычнага абсягу распадаецца на некалькі тыпалагічных груп: летапісныя аповесці і хронікі, апавяданні і белетрыстычныя аповесці пра жыццё і пакуты выбітных хрысціянскіх дзеячаў (жыціі, агіяграфія), легендарныя аповесці пра цудадзейныя абразы, перэгрынацыі, або хаджэнні, хронікі, дыярыюшы, мемуары, успаміны, пасольскія дзённікі, “казанні на смерць”, апісанні канфесійных сабораў і сінодаў, сатырычныя і гумарыстычныя творы.

**I. Saverchenko**
Institute of literature named after Yanka Kupala of the National Academy of Sciences
e-mail: ivasav@mail.ru

**The variety of genres of old Belarusian prose of the X-XVIII centuries: problems of attribution and classification**

*Key words: old Belarusian literature, style, genre, attribution, classification.*

*This article examines the variety of genres old Belarusian prose of the X – XVIII, in terms of attribution and classification.*

**Л.И. Семчёнок**
Учреждение образования «Полоцкий государственный университет»
e-mail:siamchonak@psu.by

УДК 821.112.2

## КОНЦЕПЦИЯ ЛИЧНОСТИ В РАССКАЗЕ Ф. ШИЛЛЕРА «ПРЕСТУПНИК ИЗ-ЗА ПОТЕРЯННОЙ ЧЕСТИ»

*Ключевые слова: эпоха Просвещения, моралистический рассказ, личность, общество, естественное право.*

*Рассматривается своеобразие трактовки личности знаменитого вюртембергского разбойника XVIII века И.Ф. Швана в биографической повести Я.Ф. Абеля «История одного разбойника» и рассказе Ф. Шиллера «Преступник из-за потерянной чести». Испытания, выпавшие на долю шиллеровского персонажа, обнаруживают истинную суть его душевной организации и воспроизводят традиционную повествовательную модель испытания-становления героя. История Х. Вольфа – новый этап в развитии жанра моралистического рассказа, избавляющегося под влиянием сентиментализма от упрощенного дидактизма и концентрирующего свое внимание на вопросах взаимосвязи животного и духовного начала человеческой природы.*

Рассказ Ф. Шиллера «Преступник из-за потерянной чести» («Der Verbrecher aus verlorener Ehre») был создан в середине 80-х годов XVIII столетия в один из переломных моментов творческой биографии писателя. Впервые шиллеровская интерпретация трагической истории жизни знаменитого вюртембергского разбойника Ф. Швана была опубликована во втором номере теат-

Репозиторий ВГУ